На тваю дапамогу спадзяемся і ўвесь час вочы нашыя будуць да Цябе зьвернены. Бо ты ёсьць Бог літасьцявы і чалавекалюбчы! Амін.

**Служба за хворых**

**Трапар, тон 4:** Хуткі ў абароне адзіны - Ты Хрыстос, хутка з вышыняў прыйдзі да хворых слугі Тваёй (Тваіх) (імя) і вызвалі ад хваробаў і болі, і ўзьнясі яго (яе, іх), каб асьпявалі і славілі Цябе бязперапынна малітвамі Багародзіце, адзіны Чалавекалюбчы.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Кандак, тон 5:** Тых, якія ляжаць на ложа хваробаў і сьмяротнаю ранаю скалечаны, - як калісьці падняў Ты, Збаўца, Пятрову цёшчу і разслабленага, якога неслі на насілках, - так і цяпер, Літасьцявы, іх (яго, яе), што пакутваюць (пакутвае), наведай і вылекуй, бо Ты адзіны ёсьць, які ўзяў на сябе ўсе грахі і хваробы роду нашага, і на ўсё здольны як Шматміласьцявы.

**Пракімен, тон 7:** Умілажалься зь мяне, Госпадзе, бо я нямоглы; дай мне гаеньня, Госпадзе, бо косьці мае растрывожаныя. (Пс. 6:3)

**Прычасьнік:** Умілажалься зь мяне, Госпадзе, бо я нямоглы; дай мне гаеньня, Госпадзе, бо косьці мае растрывожаныя

Алілуя. (тройчы)

**Малітва**

Ойча сьвяты, Лекару душаў і целаў, Ты паслаў Твайго адзінароднага Сына, Госпада нашага Ісуса Хрыста, дзеля аздараўленьня кожнай хворасьці і вызваленьня ад сьмерці. Ацалі слугу Твайго (Тваю) (імя) ад усіх душэўных і цялесных немачаў, якія апанавалі яго (яе). Вярні яму (ёй) здароўе, ласкаю Хрыста Твайго, малітвамі Найсьвяцейшай Уладаркі нашай Багародзіцы і Заўсёды Дзевы Марыі, і ўсіх сьвятых. Бо Ты Бог наш, крыніца збаўленьня, і мы Табе славу аддаем разам з адзінародным Сынам Тваім і з усесьвятым, добрым і жыватворчым Тваім Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.



# МАЛЕБНЫ КАНОН

Львоў
2007 л.Б.



Парахфія свт. Кірыла Тураўскага, г.Львоў

**Аўтарызавана перакладзены айцом Сяржуком Горбікам**

**Дзеля служэньняў Беларускам Праваслаўнам Абрадзе**



славіў я імя Твае сьвятое, Айца і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Мой Божа! Дзякую Цябе за тое, што даеш, за тое, што адбіраеш. Хай будзе воля Твая! Амін.

## Служба за падарожнікаў

**Трапар, тон 2:** Шляхом і праўдай Ты ёсьць, Хрыстос, дашлі цяпер Анёла Твайго слуге Тваіму (тваім), каб суправоджываў яго, як калісьці Тавію, абараняючы ад усялякай бяды дзеля славы Тваёй, ад усяго злога, дзеля ўсялякага дабра захоўваючы, малітвамі Богародзіцы, адзіны Чалавекалюбчы.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Кандак, тон 2:** Луке і Клеопе ў Эманусе Ты сябраваў, Збаўца, падаражуй і цяпер з слугой твамім (імя), які падарожжа жадае распачаць, пазбаўляючы яго ад усяго злога, бо Ты Чалавекалюбчы і Ўсямагутны.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін

**Богародзічны, тон 2:** У малітвах няспыную Богародзіцу і ў абароне нязьменнае спадзяваньня магіла і сьмерць ня вытрымалі. Бо як Маці жыцьця да жыцьця прыставіў Той, хто ўсяліўся ва ўлоньня сапраўды дзявочае.

**Пракімен, тон 7:** Дай мне рана пачуць ласку Тваю, бо я на Цябе спадзяюся. Пакажы мне, Госпадзе, дарогу, па якой мне ісьці, бо да Цябе я ўзношу душу маю. (Пс. 142:8)

**Прычасьнік:** Навучы мяне, Госпадзе, шляху Твайму, і накіруй мяне на сьцежку праўды. (Пс. 26:11)

Алілуя. (тройчы)

### Малітва

Калі апосталы Твае, Ісусе Хрысьце, былі на моры падчас навальніцы, Ты прышоў да іх, кажучы: “Ня бойцеся!”, і бура прыціхла, і Ты спакойна прывёў іх да берагу.

Так, Госпад, і (імя) пад час падарожжа; будзь (імя) памочнікам і вартаўнікам прад усякай небясьпекай; памагай (імя) у цяжкасьцях і ахоўвай ад усяго злога, якое можа (імя) спадкаць.

Аддаю (імя) пад Тваю ахову, і Ты давядзі падарожніка да шчасьлівага канца падарожжы.

пагрэбаваў. Прабач мяне, калі я зрабіў грэх гонару, альбо даў волю раззлаванаму сэрцу. Прабач мне, калі я нешта злое меў у думках, альбо нешта нядобрае вымавіў. Прабач мне ўсе мае сьвядомыя няўвагі і добраахвотную хлусьню, якое я раней нарабіў. Усё гэта прабач мне, Добры Ўладар і дай, каб я спакойна мог Табе пакланіцца і пачаць новае жыцьцё на славу Тваю, які ўладарыць з Айцом і Сынам у вякі вякоў. Амін.

## Служба на ўсялякаю просьбу

**Трапар, тон 6:** Зьмілуйся над намі Госпад, зьмілуйся над намі, бо, аніякага адказу няведаючы, гэтую малітву Табе, як Уладару, мы грэшныя ўзносім: Зьмілуйся над намі.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Кандак, тон 6:** Госпад, зьмілуйся над намі, бо мы на Табе спадзяемся. Не будзь моцны ў гневе на нас, не памянай беззаконьняў нашых, але паглядзі як міласэрдны, і вызвалі нас ад ворагаў нашых, Бо Ты ёсьць Бог наш, а мы - людзі Твае, усе - справа рук Тваіх, і імя Твае клічам.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін

**Багародзічны, тон 6:** Міласэрднасьці дзевы адчыні нам, дабраславёная Багародзіца, каб, спадзяваючыся на Цябе, мы не загінулі, але каб вызваліся праз абарону Тваю ад бедаў. Бо Ты ёсьць выратаваньня роду хрысьціянскага.

**Пракімен, тон 4:** Госпадзе, пачуй малітву маю, уваж маленьню майму па праўдзе Тваёй; пачуй мяне па праўдзе Тваёй. (Пс. 142:1)

**Прычасьнік:** Пачуй, Госпадзе, голас мой, якім я клічу; зьлітуйся зь мяне і азьвіся мне.

Алілуя. (тройчы).

### Малітва

Паглядзі, Уладыка Чалавекалюбчы, літасьцявым Тваім вокам на мяне, і выслухай мае малітвы, якія з вераў уздымаю, бо сам Ты мовіў: “Усё, што молячыся просіце, веруёёце, што атрымаеце, і будзе вам”, і яшчэ: “Прасіце, і будзе вам дадзена”. Таму і я, нягодны, спадзяваючыся на літасьць Тваю, прашу:

Дай дабраславеньня Твае мне, прабач мне мае грахі, абарані мяне ад усялякіх ворагаў, бачных і нябачных, ад усялякага жалю, бяды, хваробы і болю. Дай мне здароўя і мірнае жыцьцё, каб



**Сьвятар:** Дабраслаўлёны Бог наш спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Чытальнік:** Амін.

Уладару нябёсны, Уцяшыцелю, Духу ісьціны, што ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і Жыцьцядацелю, прыйдзі і ўсяліся ў нас і ачысьці нас ад ўсяго благога і збаў, Добры, душы нашы.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. (тройчы)

Найсьвяцейшая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе зьмілуйся. (тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш , каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як на небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Чытальнік:** Амін.

**Чытальнік:** Госпадзе, зьмілуйся. *(12 разоў)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Прыдзіце, паклонімся Ўладару нашаму Богу.

Прыдзіце, паклонімся і прыпадзём да Хрыста, Уладара нашага і Бога.

Прыдзіце, паклонімся і прыпадзём да самаго Хрыста, Уладара і Бога нашага.

## Псальма 142

Госпадзе, пачуй малітву маю, уваж маленьню майму па праўдзе Тваёй; пачуй мяне па праўдзе Тваёй і не ўваходзь у суд з рабом Тваім, бо не апраўдаецца прад Табою ніводзін жывы.

Вораг перасьледуе душу маю, затаптаў у зямлю жыццё маё, прымусіў мяне жыць у цемры, як даўно памерлых, і засмуціўся ўва мне дух мой, зьнямела ўва мне сэрца маё. Прыгадваю дні мінулыя, думаю пра ўсе дзеі Твае, разважаю пра дзеі рук Тваіх, рацягваю да Цябе рукі мае; душа мая - да Цябе, як перасохлая зямля. Хутчэй пачуй мяне, Госпадзе: дух мой зьнемагае; не хавай аблічча Твайго ад мяне, каб я не спадобіўся тым, што ў магілу ідуць. Дай мне рана пачуць ласку Тваю, бо я на Цябе спадзяюся. Пакажы мне, Госпадзе, дарогу, па якой мне ісьці, бо да Цябе я ўзношу душу маю. Вызвалі мяне, Госпадзе, ад ворагаў маіх; да Цябе прыбягаю. Навучы мяне выконваць волю Тваю, бо Ты - Бог мой; Дух Твой добры вядзе мяне ў зямлю праўды. Дзеля імя Твайго, Госпадзе, ажыві мяне; дзеля праўды Тваёй выведзі зь нягоды душу маю і зь літасьці Тваёй зьлічы ворагаў маіх, і загубі ўсіх, што ўціскаюць душу маю, бо я - Твой раб.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін. Алілуя. (тройчы)

***Трапар:*** *(каму сьпяваецца малебен)*

### Псальма 50

Зьлітуйся, Божа, зь мяне ў вялікай ласцы Тваёй, і ў мностве шчадротаў Тваіх загладзь беззаконьні мае! Адмый мяне шматкроць ад беззаконьня майго, і ад грэху майго ачысьці мяне: бо беззаконьне маё я ўсьведамляю, і грэх мой заўсёды перада мною. Табе, Табе аднаму я зграшыў і прад вачыма Тваімі благое ўчыніў: таму справядлівы Ты будзеш у прысудзе Тваім, і чысты ў судзе Тваім. Вось, я ў беззаконьні зачаты, і ў грэху маці мая нарадзіла мяне. Вось, палюбіў Ты праўду ў сэрцы і ўліў у мяне тайную мудрасьць. Акрапі мяне ісопам, і ачышчуся: абмый мяне, і бялей за сьнег адбялюся. Дай мне ўцеху пачуць і радасьць, і ўзрадуюцца косьці, Табою паламаныя. Адвярні аблічча Тваё ад грахоў маіх і загладзь усе беззаконьні мае. Чыстае сэрца ўмацуй ува мне, Божа, і дух справядлівы аднаві ўва мне. Не адкінь мяне ад аблічча Твайго і Духа Твайго Сьвятога не адбірай у мяне. Вярні мне радасьць збаўленьня Твайго, і Духам Уладным мяне падтрымай. Я навучу беззаконцаў дарогам Тваім, і бязбожныя да



# Трапары і кандакі.
# З Богародзічнымі, пракіменамі, прычасьнікамі і малітвамі на малебне

## Служба аб дапамозе Сьвятога Духа.

**Трапар, тон 2:** Божа, Творца і стваральнік усяго, скіруй сёньня Тваім дабраслаўленьням справу рук нашых, якую мы дзеля славы Тваёй пачынаем, і нас збаў ад усяго злога, бо Ты адзіны ўсямагутны і Чалавекалюбчы.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Кандак, тон 6:** Хуткій ў абароне і моцны ў дапамоге, прыйдзі цяпер дабрынёй моцы Тваёй і, дабраслаўляючы, умацуй у справе добрай імкненьня слугаў Тваіх. Бо ўсё, што толькі жадаеш, як сапраўдны Бог, рабіць здольны.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін

**Богародзічны, тон 6:** Абаронца хрысьціянаў звышгодная, малітоўніца да Творцы няспынная, не пагрэбуй маленьням грэшнікаў, але прыдзі, як добрая, з дапамогай да нас, якія шчыра сьвяваюць Цябе: Пасьпяшы на малітву, Багародзіца, і хутка прыйдзі на маленьня, абараняючы няспынна тых, што шануюць Цябе.

**Пракімен, тон 4:** І хай будзе добрая воля Госпада Бога нашага на нас, і ў дзеях рук нашых пасабляй нам, у дзеях рук нашых пасабляй. (Пс. 89:17)

**Прычасьнік:** Аднаго я прасіў у Госпада, толькі таго шукаю, каб жыць мне ў доме Гасподнім ва ўсе дні жыцьця майго, сузіраць хараство Гасподняе і наведваць сьвятыню Ягоную. (Пс. 26:4)

Алілуя. (тройчы).

### Малітва

Уладару нябёсны, Суцяшальнік, Дух праўды, зьмілуйся над мною грэшным і адпусьці мне, нягоднаму слуге Твайму, усё, у чым я вінаваты! Прабач мне, грахі, якія я нарабіў вольна альбо нявольна, сьвядома альбо несьвядома. Прабач мяне, калі я Тваім сьвятым імём кляўся, калі я ў гадзіну малітвы думаў аб нейчым іншам, альбо быў няруплівым. Прабач мяне, калі я каму дакараў альбо абгаварыў кагосьці. Прабач мяне, калі я жабраком

вайны; і каб добры і чалавекалюбны Бог наш быў міласэрны і спагадлівы да нас, адхіліў ад нас усякую небясыіеку, што нам пагражае, вызваліў нас ад сванго справядлівага гневу і зьмілаваўся над намі.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Яшчэ молімся, каб Госпад Бог пачуў голас маленьня нас, грэшных, і зьмілаваўся над намі.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Выслухай нас, Божа, Збавіцелю наш, надзея ўсіх, што жывуць на зямлі, і тых, што далёка на моры, і будзь спагадлівы да нас, грэшных, і зьмілуйся над намі. Бо Ты міласэрны і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

***Малітва:*** ...

**Сьвятар:** Мудрасьць. Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

**Людзі:** Больш годную пашаны за хэрувімаў І без параўнаньня больш слаўную за сэрафімаў, што, захаваўшы дзявоцтва, радзіла Бога-Слова, існую Багародзіцу, Цябе мы ўзьвялічваем.

**Сьвятар:** Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе.

**Людзі:** Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін. Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся. Ойча, блаславі.

**Сьвятар:** Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці, сьвятых і баганосных айцоў нашых, і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

**Людзі:** Амін.



Цябе навернуцца. Вызваль мяне ад крывавасьці, Божа, Божа ратунку майго; і язык мой уславіць праўду Тваю. Госпадзе! адкрый вусны мае, і вусны мае прагалосяць славу Табе: бо калі б ахвяры Ты пажадаў, я даў бы яе; цэласпаленьне Табе не падабаецца. Ахвяра Богу - дух упакораны; сэрца ўпакоранае і зьміранае Бог ня зьнішчае. Ушчасьліві, Госпадзе, добрай воляй Тваёю Сіён, і хай паўстануць муры Ерусалімскія. Тады ўпадабаеш Ты ахвяру праўды, прынашэньні і цэласпаленьні; тады пакладуць на алтар Твой цялят.

## Канон *(Тон 8)*
## Песьня 1

**Ірмас:** Перайшоўшы мора быццам сушу і пазьбегнуўшы ягіпецкага зла, Ізраільцянін усклікнуў: Збавіцелю Богу нашаму пяём.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

Сярод шматлікіх напасьцяў прыходжу да Цябе, шукаючы збаўленьня, Маці Слова і Дзева: ад бедаў і няшчасьцяў збаў мяне.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

Наступы спакусаў не даюць мне спакою і напаўняюць вялікай журбою душу маю: суцішы іх, Дзева беззаганная, супакоем Сына і Бога Твайго.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Малю Цябе, Дзева, што нарадзіла Збавіцеля і Бога: вызваль мяне ад няшчасьцяў, бо паД Тваю апеку прыбягаю і ўзношу да Цябе мае думкі і душу.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Адымі ад мяне хворасьці цела і душы, і ўчыні мяне годным Боскага наведаньня і Тваёй апекі, адзіная Божая Маці, што, будучы добраю, нарадзіла Дабро.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

## Песьня 3

**Ірмас:** Госпаде, Творча нябеснага кругу і За-снавальніку Царквы, мэта жаданьняў і ўмацаваньне верных, умацуй мяне ў любові Тваёй, адзіны Чалавекалюбча.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

Бяру Цябе, Багародзіца Дзева, за заступніцу і покрыва жыцьця майго: накіруй мяне да прыстанішча Твайго, Крыніца дабра, верных апора, адзіная Ўсяхвальная.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

Малю Цябе, Дзева, адымі душэўную буру журбы маёй, бо Ты, Боганявеста, адзіная чыстая, нарадзіла Начальніка сьвету.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

Маці Дабрачынца і Віноўніка ўсяго добрага, вылі на ўсіх нас багацьце дабротаў Ягоных, бо Ты, БогаДабраслаўлёная, можаш усё, нарадзіўшы ўсясільнага Хрыста.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

Памажы, Дзева, мне, што дазнаў лютых недамаганьняў і балючых цярпеньняў, бо ведаю, што Ты, Усебеззаганная, невычэрпная крыніца аздараўленьняў.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Збаў ад бедаў слугаў Тваіх, Багародзіца, бо мы ўсе пасьля Бога да Цябе прыбягаем, як да непарушнай сьцяны і Заступніцы.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Глянь міласэрна, усяхвальная Багародзіца, на лютае цярпеньне цела майго і аздараві хваробу душы маёй.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Багародзіца, збаў нас.

**Дыякан:** Зьмілуйся над намі, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

**Дыякан:** Яшчэ молімся за богалюбнага Сьвяцейшага Ўсялнскага патрыярха Канстантынопальскага, за ўладыку нашага (імя і тытул першаярарха) япіскапа нашага Пачэснага... *(імя)* і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Яшчэ молімся за яго (яе) міласьць ... *(імя галавы дзяржавы),* за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.



Зьмілаваньня дзьверы адчыні нам, дабраславёная Багародзіца: хай мы, якія спадзяемся на Цябе, ня згінем, але выбавімся Табою ад бедаў, бо Ты - збаўленьне роду хрысьціянскага.

**Дыякан:** Зьмілуйся над намі, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і зьмілуйся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

**Дыякан:** Яшчэ молімся за богалюбнага Сьвяцейшага Ўсялнскага патрыярха Канстантынопальскага, за ўладыку нашага (імя і тытул першаярарха) япіскапа нашага Пачэснага... *(імя)* і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць сваййму народу ўсіх нас.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Яшчэ молімся за слугу Божага/Божую ...*(гмя),* каб добры і міласэрны Бог наведаў яго/ яе/іх і дараваў яму/ёй/ім спакойнае жыцьцё, здароўе, посьпеху кожнай добрай справе, і каб адпусьціў яму/ёй/ім усе ягоныя/ейныя/іхнія правіны вольныя і міжвольныя.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Яшчэ молімся Госпаду Богу нашаму, каб Ён пачуў голас маленьняў нас, грэшных, і зьмілаваўся над слугою сваім/сваёю/слугамі сваімі... *(імя),* захаваў яго/яе/іх ад усякага суму, бяды, гневу і патрэбы, і ад усякае хворасьці душэўнае і цялеснае, і дараваў яму/ёй/ім здароўе і даўгалецьце. Скажам усе разам: Хутка пачуй нас і зьмілуйся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Яшчэ молімся, каб гэтаму гораду і гэтай сьвятой царкве, і ўсякаму гораду і краіне захавацца ад голаду, пошасьці, землятрусу, патопу, агню, мяча, нападу ворагаў і братабойчае

Уладарка і Маці Збавіцеля, прымі малітвы недастойных слугаў Тваіх і заступіся перад Тым, хто нарадзіўся ад Цябе: Уладарка сьвету, будзь нам Хадайніцай.

Пяём з радасьцю і ахвотаю гэтую песьню усяслаўнай Багародзіцы: разам з Прадвесьнікам і з усімі сьвятымі, маліся, Богародзіца, каб нам атрымаць зьмілаваньне.

Усе анёльскія хоры, Прадвесьнік Госпада, дванаццаць апосталаў і ўсе сьвятыя, разам з Богародзіцаю ўчыніце малітву, каб нам збавіцца.

**Чытальнік:** Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. (тройчы)

Найсьвяцейшая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе зьмілуйся. (тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш , каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як на небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Тон 6:** Зжалься над намі, Госпадзе, зжалься над намі: ня могучы даць ніякага адказу, мы, грэшныя, вось гэтую малітву Табе, Уладару нашаму, прыносім: зжалься над намі.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Госпадзе, зжалься над намі, бо на Цябе спадзяемся: ня гневайся на нас вельмі і ня будзь памятлівы нашых бясчынстваў, але глянь ласкава на нас і выбаў нас ад ворагаў нашых, бо Ты Бог наш і мы, людзі Твае і творы рук Тваіх, імя Тваё клічам.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.



Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Яшчэ молімся за слугу Божага (Божую, слугаў Божых)... *(імёны),* каб добры і міласэрны Бог наведаў яго (яе, іх) і дараваў яму (ёй, ім) спакойнае жыцьцё, здароўе, посьпех у кожнай добрай справе, і каб адпусьціў яму (ёй, ім) ўсе ягоныя (ейныя, іхнія) правіны вольныя і міжвольныя.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Яшчэ молімся за ўсіх тут прысутных людзей, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня, за ўсіх братоў і сёстраў нашых, і за ўсіх прававерных хрысьціянаў.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

Сьвятар: Бо Ты міласьцівы і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

Трапар, тон 2: Цёплае маленьне, непераможная абаронная сьцяна, крыніца міласэрнасьці, прыстанішча мірнае, безупынку клічам Цябе: Богародзіца Ўладарка, пасьпяшыся і ад бедаў выбаў нас, адзіная хуткая Заступніца.

## Песьня 4

**Ірмас:** Я пачуў, Госпадзе, провіду Твайго тайну, зразумеў дзеяньні Твае і ўславіў Боства Тваё.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Жаданьняў маіх хваляваньне і буру правінаў маіх суцішы, Боганявеста, што нарадзіла нам Госпада.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Міласэрнасьці Тваёй бездань дай мне, які клічу Цябе, Маці Добрасардэчнага і Збавіцеля тых, што славяць Цябе.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Будучы ўдзельнікамі Тваіх, Усячыстая, дароў, вызнаем Цябе як Багародзіцу, і пяем Табе песьню ўдзячнасьці.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Надзею і ўмацаваньне, і збаўленьня сьцяну маючы ў Табе, Усяслаўная, вызваляемся ад усякай небясьпекі.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

## Песьня 5

**Ірмас:** Прасьвятлі нас запаветамі Тваімі, Госпадзе, і рукою Тваёю высокаю дай нам Твон супакой, Чалавекалюбча.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Напоўні вясельлем сэрца маё, Чыстая, што нарадзіла Віноўніка вясельля, і дай мне Тваю непрамінальную радасьць.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Ад бедаў выбаў нас, Богародзіца чыстая, што нарадзіла Збаўленьне вечнае і Супакой, што пераўзыходзіць усякі розум.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Разгані туман правінаў маіх зьзяньнем сьветласьці Тваёй, Баганявеста, што нарадзіла Сьвятло незаходнае і вечнае.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Вылечы, Чыстая, душы маёй немачы, удастоіўшы мяне наведаньнем сваім, і малітвамі Тваімі аздараві мяне.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

## Песьня 6

**Ірмас:** Малітву занясу да Госпада і аб'яўлю Яму жаль мой, бо душа мая напоўнілася ўсякага зла, і жыцьцё маё да пекла наблізілася, дык малюся як Ёна: захавай мяне, Божа, ад тленнасьці.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Госпада і Сына Твайго, што ад сьмерці і тленнасьці збавіў сапсаваную сьмерцю і тленнасьцю істоту маю, аддаўшы сябе дабравольна на сьмерць, малі, Дзева, каб Ён вызваліў мяне ад варожае злосьці.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.



**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

## Песьня 9

**Ірмас:** Сапраўднай Богародзіцаю вызнаем Цябе, Дзева чыстая, і з анёльскімі хорамі славім Цябе.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Не адвярніся ад струменяў сьлёз маіх, Дзева, што з кожнага твару сьлёзы абціраеш, бо Ты нарадзіла нам Хрыста.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Радасьцю напоўні сэрца маё, Дзева, што прыняла спаўненьне радасьці, і зруйнавала грахоўны сум.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Прыстанішчам і Заступніцаю будзь для тых, што прыбягаюць да Цябе, Дзева, і непарушнаю сьцяною, сховішчам, покрывам і радасьцю.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Разганяючы цемру няведаньня зьзяньнем сьветласьці Тваёй, прасьвятлі, Дзева, тых, што пабожна вызнаюць Цябе Богародзіцаю.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Выратуй, Дзева, мяне, які ляжу прыніжаны ў немачах маіх, і ад недамаганьняў да здароўя вярні мяне.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Дастойна ёсьць сапраўды называць шчасьліваю Цябе, Багародзіцу, вечна дабраслаўлёную і беззаганную Маці Бога нашага. Больш годную пашаны за хэрувімаў і без параўнаньня болын слаўную за сэрафімаў, што, захаваўшы дзявоцтва, радзіла Бога-Слова, існую Багародзіцу, Цябе мы ўзьвялічваем.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Вышэйшую за нябёсы і чысьцейшую за прамяні сонечныя, што выбавіла нас ад праклену, Уладарку сьвету ў песьнях ушануем.

Ад безьлічы грахоў маіх зьнемагае цела маё, зьнемагае і душа; да Цябе прыбягаю, Поўная ласкі, надзея зьняверaных: Ты мне памажы.

## Песьня 7

**Ірмас:** Юнакі юдэйскія ў Бабілёне некалі патройнаю вераю полымя агню патушылі, пяючы: Дабраслаўлёны Ты, Божа айцоў нашых.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Жадаючы ўладкаваць нашае збаўленьне, Ты, Збавіцелю, пасяліўся ва ўлоньні Дзевы, якую Ты паказаў сьвету як Заступніцу. Дабраслаўлёны Ты, Божа айцоў нашых.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Нарадзіўшы Прыхільніка міласьці, малі Яго, Маці чыстая, каб Ён вызваліў ад правінаў і душэўнай нячыстасьці нас, якія клічам: Дабраслаўлёны Ты, Божа айцоў нашых.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Ты паказаў Маці Тваю як скарбніцу збаўленьня, крыніцу несьмяротнасьці, вежу абаронную і браму пакаяньня для тых, што клічуць: Дабраслаўлёны Ты, Божа айцоў нашых.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ад цялеснай слабасьці і душэўных недамаганьняў, ласкава вызвалі тых, што з любоўю прыбягаюць пад покрыва Тваё, Богародзіца Дзева, што нарадзіла нам Збавіцеля.

## Песьня 8

**Ірмас:** Уладара нябеснага, якога хваляць анёльскія хоры, слаўце і ўзьвялічвайце праз усе вякі.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Не пагардзі, Дзева, тымі, што маюць патрэбу ў Тваёй дапамозе, і хваляць і ўзьвялічваюць Цябе праз усе вякі.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Ты, Дзева, аздараўляеш немачы душы маёй і цялесныя хворасьці, каб мне праслаўляць Цябе, Чыстая, праз усе вякі.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Шмат аздараўленьняў даеш, Дзева, тым, што Цябе верна славяць у песьнях і выхваляюць невыказнае сынараджэньне Тваё.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ты адганяеш прыступы спакусаў і ўздымы пажаданьняў, Дзева, дзеля гэтага славім Цябе ў песьнях праз усе вякі.



Ведаю Цябе, Дзева, як заступніцу жыцьця і надзейную ахову, што перамагае буры пажаданьняў і праганяе наступы д'ябальскія. Малю Цябе няспынна: ад маіх дрэнных пажаданьняў вызваль мяне.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Мы знайшлі ў Табе, Дзева, ахоўную сьцяну, дасканалае збаўленьне душаў і палёгку ў суме Зьзяньнем Тваім заўжды радуемся: дык, Уладарка, і цяпер ад страсьцяў і бедаў вызваль нас.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

Ляжу зьнямоглы на пасьцелі маёй, і няма лекаў для цела майго; але малюся Табе, Добрая, што нарадзіла Бога і Збавіцеля сьвету: уздымі мяне ад тленных немачаў.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Збаў ад бедаў слугаў Тваіх, Богародзіца, бо мы ўсе пасьля Бога да Цябе прыбягаем, як да непарушнай сьцяны і Заступніцы.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Глянь міласэрна, усяхвальная Богародзіца, на лютае цярпеньне цела майго і аздараві хваробу душы маёй.

**Прысьпеў:** Найсьвятая Богародзіца, збаў нас.

**Дыякан:** Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Дыякан:** Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Дыякан:** Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, Найдабраслаўлёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё ясыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

**Людзі:** Табе, Госпадзе.

**Сьвятар:** Бо Ты Ўладар сьвету і Збавіцель душаў нашых, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

*Тут можа чытацца акафіст*

**Дыякан:** Будзьма ўважлівыя. Мудрасьць, слухайма ўважліва!

**Пракімен:** ...

**Дыякан:** Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Сьвятар:** Бо Ты сьвяты, Божа наш, і сярод сьвятых спачываеш, і мы Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Дыякан:** Усё, што жыве, хай хваліць Госпада.

**Людзі:** Усё, што жыве, хай хваліць Госпада.

**Дыякан:** Хваліце Госпада ў сьвятых Яго, хваліце Яго ў велічы сілы Яго.

**Людзі:** Усё, што жыве, хай хваліць Госпада. **Дыякан:** Усё, што жыве.

**Людзі:** Хай хваліць Госпада.

**Дыякан:** І каб нам быць дастойнымі слухаць Сьвятое Евангельле, Госпада Бога молім.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

**Дыякан:** Мудрасьць, устаньце, будзем слухаць Сьвятое Евангельле.

**Сьвятар:** Мір усім. Людзі: І твайму Духу.

**Сьвятар:** Чытаньне Сьвятога Евангельля ...

**Людзі:** Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

**Дыякан:** Слухайма ўважліва.

**Евангельля:**

**Людзі:** Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

*(Тон* 6) Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Ойча, Сыне і Духу, Тройца сьвятая, ачысьці мноства правінаў нашых.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Малітвамі Багародзіцы, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.



Зьмілуйся нада мною, Божа, паводле вялікай міласэрнасьці Тваёй і паводле велічы дабротаў Тваіх ачысьці беззаконьне маё.

Ня дай мне спадзявацца на людзкую помач, . усесьвятая Ўладарка, але прымі малітвы слугі Твайго: жаль і сум мяне агарнуў, не магу цярпець дэманскіх нападкаў, ня маю, няшчасны, аховы, ні дзе ўкрыцца; пераможаны, не знаходжу суцяшэньня, апроч Цябе, Уладарка сьвету: Надзея і Заступніца верных, не пагардзі малітвамі маімі, але ўчыні карыснае мне.

**Дыякан:** Збаў, Божа, людзей Тваіх і блаславі набытак Твой, наведай сьвет Твой міласэрнасьцю і дабротамі Тваімі, узьнясі рог хрысьціянаў і зышлі на нас Твае багатыя ласкі. Малітвамі найчыстае Ўладаркі нашае Багародзіцы і Заўсёды Дзевы Марыі; сілаю пачэснага і жыватворчага Крыжа; заступніцтвам сьвятых нябесных сілаў анёльскіх; малітвамі сьвятога, слаўнага прарока, Прадвесьніка і Хрысьціцеля Яна; сьвятых слаўных і годных пахвалы апосталаў Пятра і Паўла, і ўсіх сьвятых апосталаў; між сьвятымі айцоў нашых, сусьветных вялікіх настаўнікаў і сьвятаначальнікаў Базыля Вялікага, Рыгора Багаслова і Яна Залатавуснага; між сьвятымі айца нашага Міколы цудатворцы, арцыяпіскапа Мірлікійскага; сьвятых слаўных і роўных апосталам настаўнікаў славянскіх Кірылы і Мятода; між сьвятымі айца нашага Кірылы, япіскапа Тураўскага; сьвятое маці нашае Еўфрасіньні Полацкае, асьветніцы Беларусі і ўсіх сьвятых заступнікаў беларускага народу; сьвятога (сьвятой) ... *(імя сьвятога дня);* сьвятых і праведных багаайцоў Якіма і Ганны і ўсіх сьвятых: просім Цябе, міласэрны Госпадзе, выслухай нас грэшных, якія молімся Табе, і зьмілуйся над намі.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся. *(12 разоў)*

**Сьвятар:** Міласэрнасьцю, дабротамі і чалавекалюбствам адзінароднага Сына Твайго, з якім Дабраслаўлёны Ты і Твой усесьвяты, добры і жыватворчы Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.